№ 1 Нядзеля, 22 Чэрвеня 1924 г. Год I.

ГРАМАДЗКІ ГОЛАС

Выходзіць тры разы ў тыдзень. Цана нумару 15 грошай.

Падпісная цана на 1 месяц 1 злоты 20 гр. За граніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Людвісарская вул. дом № 4. (Wilno, Ludwisarska 4). Рэдакцыя адчынена ад 10—2 гадз. Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. удзень, апрача сьвятаў.

Цана абвестак за радок пэтыту: на 1 стар. — 15 гр. у тэксьце — 10 гр. на апош. стар.— 5 гр.

АБВЕСТКА.

I.

Беларускае Грамадзянскае Сабраньне просіць сяброу і інш. асоб, якія узялі для чытаньня кніжкі, зьвярнуць іх у бібліятэку Грамадзянскага Сабраньня да 1 ліпня г. г.

II.

Напамінаецца сябром, што за першае паугода сяброускія узносы належыць унясьці да 1 ліпня г.г. Няунесшыя будуць лічыцца выбыушымі.

Прэзэс Рады Старшыняу ВАЛЭЙША.

Грамадзяне!

Пішэце нам аб жыцьці нашых мястэчак і весак, як хто умее, падаючы толькі праудзівыя факты. Карэспандэнцыі павінны быць з праудзівым імем, прозьвішчам і адрэсам аутара. Падпісаны-ж яны могуць быць псэудонімам (выдуманым прозьвішчам). Аплата выдрукаванага матар'ялу залежыць ад Рэдакцыі. Няпрынятыя у друк рукапісы назад вяртацца ня будуць.

Беларусы!

Чытайце і пашырайце газэту на сваей роднай мове — „Грамадзкі Голас". Не шкадуйце грошай на падпіску, калі хочаце, каб да вашага голасу прыслухваліся!

Вільня, 22 чэрвеня 1924 г.

У цяжкі момэнт палітычнае нядолі Беларускага народу зьяуляецца на сьвет нашая часопісь.

Паднятая у вышыню громам сусьветнае вайны і зазіхацеушая на ніг з-пад развалінау царскае Расеі, беларуская грамадзкая думка, выкінуушы ідэал самазначэньня роднага народу, пачала гаснуць і стуляцца за цеснае гурткоушчыны пад ударамі суровае рэальнасьці.

Гэтай рэальнасьці мы сьмела заглядаем у вочы і таксама сьмела павінны прызнаць, што тут у часьці нашае роднае зямлі, увайшоушай у склад Польскае Рэспублікі пануе блізу што поунае безгалоуе у беларускім адраджэнскім руху. Няма адкрытага грамадзкага пляцу, дзе кожны беларус мог-бы знайсьці агульную мову ня толькі са сваімі землякамі-аднадумцамі, але і з рознымі палітычнымі індывідуальнасьцямі, што вядуць тую ці іншую працу на роднай ніве. Недарэчная, нікому хіба непатрэбная, грызьня вельмі часта замяняе сабою гэтак патрэбны адзіны нацыянальны фляк творчасьці.

Мы ставім сабе, як задачу, яднаньне усяго сьвядомага беларускага грамадзянства дзеля бязумоунага адстойваньня усіх належных нашаму народу правоу, загарантованых Констытуцыяй Польскае Рэспублікі пры саусім леяльным выпауняньні абавязкау, наложаных ею на кожнага грамадзяніна гаспадарства.

Падазронасьць з боку улады да усяго беларускага, дарэмнае імкненьне спольшчыць да непазнавальнасьці адвечных жыхароу нашага краю рана ці позна перастане быць мэтай урадаваньня на той зямлі, якая аж занадта шмат паліта крывёю народау.

З дэспотычнае імпэрыі жандарау Эуропы, а расейскіх цароу, якая была для нас, як для нацыі, самаю агіднаю турмою, беларус выйшау усе-ж такі самабытным, хаця крыху і пакалечаным.

Русыфікатарская палітыка царскіх апрычнікау не забіла насьмерць душы беларускае, але палітыка гэтая пагрузіла яе у векавую летаргію і праз доугія гады нацыянальная сьвядомасьць наша не праяуляла жыцьця.

Найбольшым праступленьнем царызму было вырываньне з беларускае гушчы народнае простых мужыцкіх дзяцей і перарабляньне іх на расейцау праз школы, казармы, цэрквы і г. д.

У меньшай часьці беларускага народу, у каталіцкай яго часьці ішла паціху, як процівага русыфікацыі—палянізатарская праца ксяндзоу.

Штучны падзел народнае інтэлігэнцыі адбівауся блага на самых народных масах. Інтэлігэнцыя не магла, дзякуючы чужацкай школе, вытварыць вечных нацыянальна-культурных вартасьцяу. Яна выбілася з каляіны народнага жыцьця. Паднятая сусьветнымі падзеямі хваля адраджэньня пачала вяртаць дадому нашыя культурныя сілы.

Але цяжкія варункі штодзеннага жыцьця не даюць магчымасьці аб'яднацца гэтым сілам дзеля спакойнага і свабоднага узбагачваньня народу нацыянальна-культурнымі вартасьцямі у сучасны момэнт.

І вось сягоньня большасьць нашае народнае інтэлігэнцыі, пазбауленая тут магчымасьці працы па сваей спэцыяльнасьці, знаходзіцца у стане нейкага духоунага заняпаду. Хто мае моцную аселасьць у роднай весцы, той корміцца земляробствам на ніве прадзедау, хто ня мае грунту у родным кутку, той шукае лёсу па-за межамі Польскае Рэспублікі.

Дзе-якая нацыянальна-прасьветная праца пакрысе у нас вядзецца, але нажаль у вельмі вузкіх рамках.

Народная прасьвета, родная школа на нашай мове як-бы і ня іструе у той час, калі яна саусім загарантована аснаумымі польскімі дзяржаунымі законамі.

А час-жа не чакае, ляціць як заусёды. Разрашэньне усіх пытаньняу бягучага народнага жыцьця напрашваецца дауно і гуртаваньне усіх нашых сьвядомых грамадзкіх сіл дзеля саусім легальнай (паутараем гэта!) творчасьні далей адкладавацца ня можа.

Новы французскі урад.

Толькі што закончыўся ўрадовы крызыс у Францыі, за ходам якога вельмі ўважна сачыла ўся Эўропа. Дзеля лепшага зразуменьня гэтага гістарычнага факту трэба паказаць на тую вялізную ролю, якую грае Францыя ўва ўсёй эўропэйскай палітыцы. Францыя, як ведама, вынесла на сваіх плячох увесь цяжар сусьветнае вайны і больш за ўсіх пасабляла ўдачнаму яе канцу. Перамога над Нямеччынай, якая пасьля разгрому францускае арміі пад Сэданам у 1871 годзе трымала сябе надта пазабіяцку і ўсю Эўропу трымала ў напружаным палажэньні, моцна падняла нацыянальную самасьвядомасьць францускае нацыі. Дзякуючы гэткаму паднятаму патрыятычнаму настрою, выбары ў францускую палату дэпутатаў у 1919 годзе дадаліся поўнаю перамогаю гэтак праванацыяналістычнага нацыянальнага блёку, ў склад якога ўваходзілі патрыятычна настроеныя правыя партыі. [illegible] дзілі [illegible]

Але поўнаю перамогаю на палёх бітвы яшчэ ня мінула для Францыі небясьпека з боку Нямеччыны. Апошняя, расчараваўшыся ў міравых варунках, якія аказаліся даволі цяжкімі, пачала з першых-жа дзён пасьля падпісаньня Вэрсальскага трактату ўхіляцца ўсімі магчымымі спосабамі ад прынятых на сябе абавязаньняў і рыхтавацца да новае вайны проці Францыі. Само сабою разумеецца, што францускі ўрад ня мог глядзець праз пальцы на тое, як немцы будуць рыхтавацца да новае вайны, якая ў будучыне можа скончыцца перамогаю Нямеччыны. А ўсім добра ведама з мінулае вайны, што значыць быць пад уладаю Нямеччыны. І францускі ўрад назнае з толькі

што пайшоўшым у адстаўку прэм'ерам Пуанкарэ і прэзыдэнтам рэспублікі Мільеранам павінен быў, ў імя будучае бясьпечнасьці Францыі прыняць усе законныя меры дзеля аклязаньня немцаў і ўхіленьня небясьпекі з іхняга боку. Меры гэтыя крыліся, перш за ўсё, ў тым, што ад немцаў патрэбавалі акуратнага выпаўненьня міравых абавязаньняў, як выплата належнае контрыбуцыі і разбраеньне, што ў сваю чаргу павінна было аслабіць і ваенную моц Нямеччыны. А калі немцы катэгорычна адмовіліся ад выплаты даўгоў, апраўдаваючыся сваею неплатаздольнасьцю, дык Францыя пастанавіла прыняць прымусовыя меры (санкцыі), якія дапушчаліся ў падобных выпадках Вэрсальскім трактатам, і окупавала найбагацейшую прамысловую провінцыю Нямеччыны з найвялікшымі ваеннымі заводамі, вуглявымі капальнямі і жалезнымі руднікамі.

Немцы адказалі на гэта тым, што пачалі пасыўна працівіцца, гэта азначала тое, што нямецкі ўрад плаціў сваім вураднікам і рабочым, трэбуючы ад іх у імя даўгу перад бацькаўшчынай, адмовы ад працы і тварэньня ўсялякіх труднасьцяў окупацыйным уладам. Гэткі характар дзеяньняў нямецкага ўраду цягнуўся цэлы год са студня месяца 1923 году да студня 1924 г. і давёў у рэзультаце да фінансавае і эканамічнае катастрофы Нямеччыну, што ў сваю чаргу адбілася на эканамічным дабрабыце ўсяе Эўропы, ў тым ліку Польшчы, Францыі і асабліва Англіі, цесна зьвязаных у эканамічным сэнсе з Нямеччынаю. Гэтая акалічнасьць і паслужыла прычынаю расколу сярод Антанты, а таксама росту агульнага нездаволеньня палітыкаю францускага ўраду нацыянальнага блёку, які ня змог мець перамогі на эканамічным фронце, пасьля таго, як Францыя выйшла пераможцаю на палёх бою. Францускі абываталь у рэзультаце перамогі апынуўся ў шмат горшых матар'яльных варунках, чымся быў перад вайною. У гэткім настроі ён пайшоў на выбары 11-га траўня.

Выбары ў францускую палату дэпутатаў саўсім неспадзявана для шмат каго закончыліся поўным паражэньнем нацыянальнага блёку і перамогаю левых партыяў. Далейшым пасьледзтвам перамогі 11-га траўня зьяўляецца адстаўка Пуанкарэ і Мільерана і замена іх прэзыдэнтам Думэргам і прэм'ерам Эрыо. Зьмена ўраду ў Францыі спаткана ўва ўсёй Эўропе вельмі радасна. Асабліва трыумфуюць перамогу левага францускага блёку ў Бэрліне і Лёндане. Але невядома, ці ўдасцца новаму радыкальнаму францускаму ўраду ўдачна разрашыць рэпарацыйнае пытаньне, з якім ня [illegible]іўся ранейшы ўрад. Усе будзе залежаць [illegible] ад добрае волі Нямеччыны. А ў Польшчы толькі левыя партыі прылучыліся да агульнага трыумфу з прычыны паражэньня францускага нацыянальнага блёку і адстаўкі Пуанкарэ і Мільерана. А шмат хто з глыбокім жалем аднёсься да адстаўкі тых францускіх дзяржаўных дзеячоў, якія падтрымалі Польшчу, калі яна была пакінена ўсімі іншымі дзяржавамі.

І. С.

Палітычны крызыс у Італіі.

Фашыстаўская дыктатура ў Італіі перажывае момэнт даволі моцнага пералому. Таямнічае забойства соцыялістычнага сябра парлямэнту Якуба Маттэотті выклікала арышты 70 асобаў, у тым ліку дырэктара газэты „Corriera Italiano" Філіпэлі.

Міністры падалі прэм'еру Мусоліні заявы аб адстаўцы, пакідаючы яму свабоду дзеяньня.

Відочна забойства палітычнага праціўніка адбылося не бяз веды ўрадовае фашыстаўскае партыі, якая ў свой час прыйшла да ўлады ў Італіі шляхам дзяржаўнага перавароту, бо [illegible] самы факты забойства не зрабіў-бы [illegible]нага ўражаньня на загаварыўшых [illegible] міністраў.

Як разьвінуцца падзеі ў Італіі далей, пакажа бліжэйшая будучына. Але нячуваны спосаб палітычнай барацьбы — забойства Маттэотті павінна не прайсьці незаўважаным міма вушэй палітычнага сьвету цэлае Эўропы. Соцыялістычныя кругі Захаду забойства Маттэотті напэўна зацікавіць ня менш, як забойства напярэдадні сусьветнае вайны найвыдатнейшага францускага соцыялісты Жана Жорэса. Уражаньне можа быць [illegible] моцным хіба толькі таму, што цяпер [illegible] менш мала аддае ў Эўропе спаленым за вайну [illegible] і таму, што цэннасьць чалавечага жыцьця ў вачох, перажыўшых масавыя [illegible] забойствы, народаў моцна панізілася.

Хто-ж быў Маттэотті і за што ён забіты?

Як ужо пасьпелі паведаміць газэты, Маттэотті — гэта сэкрэтар Італьянскае Соцыялістычнае Партыі, меў толькі 37 гадоў, радзіўся ў дробнай мяшчанскай сям'і, па профэсіі быў юрыстам і спэцыялістам па крымінальнаму праву. Большую часьць вайны прасядзеў у [illegible] астрозе, як праціўнік вайны і толькі [illegible] з вастрогу, пачаў жывую дзейнасьць у соцыялістычнай партыі [illegible] найгоршыя для партыі момэнты, калі камунізм сеяў спусташальныя ідэі, а фашызм паліў матар'яльныя здабыткі соцыялістычнае партыі і забіваў яе сяброў, Маттэотті заняў пасаду партыйнага сэкрэтара. Дзякуючы яму партыя здолела вынесьці найцяжэйшыя часы фашыстаўскага разгулу, выдавала ўласную штодзенную газэту, а на апошніх выбарах адтрымала найбольшы лік галасоў сярод опозыцыйных да фашызму партыяў. Маттэотті адтрымаў пасольскі мандат з Рыму і Вэнэцыі. Ен быў найстрашнейшым праціўнікам фашыстаў, якія няраз прысылалі яму анонімныя (нікім непадпісаныя) прыгавары сьмерці і навет у 1921 г., падчас выбараў, першы раз былі схапілі яго.

Маттэотті ведаў усе штучкі фашыстаў і адважна выступаў проці палітыкі пастаўленага імі ўраду. Мусоліні проста заяўляў, што нябожчык зьяўляўся яго найнебясьпечнейшым ворагам. Апошняе, якое Маттэотті меў зрабіць перад самаю сьмерцяй выступленьне яго ў парлямэнце мелася быць вельмі грозным для пануючай у Італіі партыі. Гэта, як відаць і прысьпяшыла патрэбу з боку апошняе расправіцца з ім чыста пафашыстаўску. Злоўлены сярод белага дня на аднэй з людных вуліц Рыму, Маттэотті згінуў бясьсьледна.

Аднак гэткі нялюдзкі спосаб расправы з палітычным праціўнікам страсянуў навет самыя міністэрскія крэслы фашыстаў і можа выклікаць у далейшым паважны палітычны крызыс.

Няма нічога дзіўнага, што ў парлямэнтарнай заходня-эўропэйскай дзяржаве, якою зьяўляецца Італія, ня можа пытаньне аб уладзе рашацца спосабам аднаго голага гвалту, да якога ў сваім часе ўдаўся Бэніто Мусоліні — цяперашні прэм'ер-міністар, ня лічачыся з выпрацаваным пачуцьцём права сярод шырокіх народных масаў.

Н. Л.

Навуковыя навіны

Чортавы праменьні або праменьні сьмерці.

Не пасьпелі яшчэ загаіцца цяжкія раны, зробленыя мінулаю сусьветнаю вайною, як усе народы быццам як у трасцы рыхтуюцца да новае вайны, якая можа быць самаю страшэннаю па сваіх спосабах нішчэньня жывое сілы. Будучая вайна будзе весьціся, галоўным чынам, усялякімі атрутнымі газамі, якія здольны зьнішчыць усякае жыцьцё на зямлі. Газы гэтыя будуць разносіцца далека ў сярэдзіну няпрыяцельскага краю цераз наветраплавальныя апараты. Пасьля гэтага робіцца зразумелым, чаму натуга ўсіх гаспадарстваў скірована на павялічэньне паветраплавальных сілаў. І няма такіх вынаходаў ці ўдасканаленьняў у тэхніцы, якія ня ўжываліся-б дзеля ваенных мэтаў. Пэўна-ж, усё гэта трымаецца ў строгай тайне і можа высунуцца наверх толькі падчас самае вайны. Напрыклад, усім вядома, што робяцца масавыя практыкаваньні з атрутнымі газамі ў Францыі, Англіі, Савецкай Расеі і іншых дзяржавах. Таксама вядома, што падчас няўдачнага досьледу ў аднэй з хімічных лябораторыяў у Нямеччыне загінула некалькі вучоных і прафэсароў. Дык невядома, якія рэзультаты ў гэтым сэнсе дасягнемы ў розных дзяржавах.

Але найбольшую сэнсацыю выклікаў нядаўны вынаход англійскім вучоным Грындэлем Мацьюсам таямнічых электрычных праменьняў, якія называюцца праменьнямі сьмерці або чортавымі праменьнямі. Досьледы з гэтымі праменьнямі робяцца, пакуль што, ў малым разьмеры. Але судзячы па голасе спэцыяльнае прэсы, [illegible] праменьням належыць вялікая будучына [illegible] здольныя будуць зрабіць поўны пераварот у будучай ваеннай тэхніцы.

Праменьні Мацьюса [illegible] роду — [illegible] або фіялетавыя, якія могуць быць ужыты [illegible] чэньні падобна да рэнтгэнаўскіх праменьняў і нявідныя або „праменьні сьмерці", якія зьяўляюцца па сваіх свойствах самымі небясьпечнымі. Нявідныя прам. здольны на пэўным прасторы забіваць жывыя істоты, растапляць мэталы, спыняць жывую мэханічную энэргію, паралізаваць электрычны ток і інш. Будучы наведзенымі на лятучы паветраны апарат, могуць спыняць дзейнасьць машыны (мотор) і спусьціць яе на зямлю. Будучы пушчанымі магутнаю станцыяй у розныя кірункі могуць спыніць рух тысячаў самаходаў на абмяжованым прасторы і т. д.

Гэты вынаход зьяўляецца самаю магутнаю зброяю барацьбы проці аэропланаў і, значыцца, проці вайны атрутнымі газамі. У Англіі ўжо [illegible]валася ўжо буйнае акцыянэрнае таварыства, якое фінансуе вынаход Мацьюса. Але, як толькі зьявілася чутка аб вынаходзе чортавых праменьняў Мацьюса, дык адначасна ў Маскве разышлася вестка аб вынаходзе там аналёгічных праменьняў інжэнерам Грамачыкам. Чутка гэтая саўсім падобна да праўды, таму што нямецкія вучоныя даўно працуюць у гэтым кірунку і, здаецца, вельмі ўдачна. Толькі яны не рэклямавалі гэтага, падобна да таго, як для цэлага сьвету зьявілася неспадзяванаю іхняя гармата, якою абстрэльвалі Парыж, падчас мінулае вайны на 90 кілёмэтраў адлегласьці. Нічым іншым, як толькі існаваньнем у Нямеччыне падобных нявідных праменьняў, тлумачыцца катастрофа 18 францускіх аэропланаў, якія па нявыясьненай дасюль прычыне ўпалі у кароткі пэрыяд часу, пералятаючы цераз нямецкую тэрыторыю ў кірунку на Прагу. Лятуны ўсе засталіся забітымі, а маторы і часьці апаратаў зруйнованымі. Гэткім чынам, у той час, як Мацьюс робіць досьледы з чортавымі праменьнямі толькі ў малым маштабе, немцы ўжо прыстасоўваюць іх на практыцы. Гэта, пакуль што, не даказана, але ёсьць усе падставы думаць, што чортавы праменьні выкрыты ў Нямеччыне шмат раней, чымся ў Англіі. А раз яны вядомы немцам, дык хутка зробяцца вядомымі і Савецк. Расеі, з якою яны супольна працуюць над падрыхтоўкаю да будучае вайны.

Вельмі сумна, што ўсе гэтыя вынаходы чалавецтва ня можа скарыстаць дзеля палепшаньня свайго жыцьця, а ўжывае дзеля самазьнішчэньня.

І.

Палітычная хроніка.

Польшча.

Вітос аб конституцыі.

На сходзе ў Цешыне пасол Вітос заявіў, што яго партыя стаіць за павялічэньне ўлады Прэзыдэнта, з пагляду на склад Сойму. Лідэр польскіх народнікаў (людоўцаў) падкрэсьліў вельмі вялікі лік паслоў, якія не зьяўляюцца на паседжаньні. Гаварыў таксама аб выплаце пасольскіх дыетаў за паседжаньні, а не памесячна. [illegible] датычыць Сэнату, дык калі ён акажацца патрэбным — яго трэба ўзмацніць, калі не — дык зьліквідаваць.

Паўнамоцтвы.

На паседжаньні Рады Міністраў 16 г. м. прынята пастанова аб папраўцы да закону аб узмацненьні скарбовае і грамадзкае гаспадаркі. Некаторыя справы, як напрыклад, справа абавязаньняў [illegible] сумы рэдковых [illegible] што трэба іх урэгуляваць да 1-га ліпня г. году. Дзеля гэтага паўстае патрэба, каб дапоўніць проект закону аб узмацненьні скарбовай і грамадзкай гаспадаркі пастановаю, якая ўпаважніць разрашаць гэтыя справы шляхам распараджэньняў Прэзыдэнта Рэспублікі.

Кракаўскі працэс.

Ужо два з лішкам тыдні ў кракаўскім судзе прысяжных цягнецца працэс аб беспарадках, якія мелі месца ў Кракаве, ў лістападзе месяцы мінулага 1923 году.

Соймавыя фракцыі польскіх соцыялістаў, саюза „Вызваленьня" і „Народнай Еднасьці", а таксама сялянскі саюз падалі інтэрпэляцыю старшыні ўраду аб неналежным павядзеньні судовых і пракурорскіх уладаў падчас працэсу.

Францыя.

Новы ўрад.

Пасьля перамогі левых партыяў на быўшых у мінулым траўні месяцы выбарах у Палату Дэпутатаў (Сойм), выйшлі ў адстаўку прэзыдэнт рэспублікі Мільеран і прэм'ер-міністар Пуанкарэ. Новы прэзыдэнт Думэрг даручыў стварэньне кабінэту Эрыо, які ўжо стаў на чале створанага ўраду. У склад кабінэту Эрыо ўваходзіць 4 сэнатары, 13 паслоў і [illegible]парлямэнтарны міністар вайны гэн. Нольлэ. Чатыры сэнатары належаць да левых дэмократаў, левых радыкалаў і соцыялістаў. З паслоў два партфэлі адтрымалі левыя радыкалы, восем радыкалы і радыкальныя соцыялісты, тры — соцыялісты-рэспубліканцы.

Дэклярацыя новага францускага ураду.

Кабінэт Эрыо устанавіў тэкст урадовай дэклярацыі, важнейшымі пунктамі якое зьяўляюцца: агульная амнэстыя, прыняцьце да працы звольненых за забастоўкі чыгуначнікаў, скасаваньне амбасады пры Ватыкане, зьменшэньне часу ваеннае службы, адмена распараджэньняў, якія мелі сілу закону, манаполь на [illegible], бюд'жэтная раўнавага, строгае выпаўненьне закону аб падаходным падатку, новыя беспасрэдныя падаткі, выпаўненьне закону аб 8 гадзінным рабочым дні, пашана да правоў сындыкатаў, рэформа адміністрацыі і інш. У заграпічнай палітыцы дэклярацыя па[illegible]

н.мае справу консолідацыі міру праз міжнародныя саюзы, расшырэньне ролі Лігі Народаў, Міжнароднага Бюра Працы і Міжнароднага Трыбуналу ў Гаазе, нармальныя адносіны з Расеяй, варункове ўтрыманьне окупацыі Руры, кантроль над раззбраеньнем Нямеччыны.

Англія.

Прэм'ер Мак-Дональд заявіў у ангельскім парлямэнце, што перад васеньняю сэсіяй ня будзе новых выбараў.

Аблога пасольства.

Ангельскае пасольства ў Мэксыцы аблажана паліцыяй па распараджэньню прэзыдэнта Обрэгона, які не пазваляе ангельскаму паслу выехаць з Мэксыкі.

Італія.

Забойства пасла.

Таямніча забіты соцыялістычны пасол Матэоті (Matteotti) сэкрэтар партыі аб'яднаных соцыялістаў, як паведамляюць газэты, меў вельмі важныя дакумэнты, компромітаваўшыя ўрадовую партыю фашыстаў. Жонка забітага заявіла, што ён выйшаў з кватэры ў аўторак на прайшоўшым тыдні, кіруючыся проста ў парлямэнт, узяўшы з сабою разам з невялікаю сумаю грошай (толькі каля 10 лірау) *партфэль, у якім знаходзіліся нязвычайна важныя дакумэнты, могушчыя служыць матар'ялам для вялікае процірурадовае прамовы*, што мела быць сказанаю ў сераду.

С. С. С. Р.

Раскол у камунізьме.

Як паведамляе нямецкая газэта „Lokal Anzeiger", цэнтральны выканаўчы камітэт расейскае камуністычнае партыі выпусьціў 18 мінулага траўня вельмі сэкрэтны цыркуляр, у якім, паміж іншым, тавораыцца: „Расейская камуністычная партыя перажывае цяпер найцяжэйшыя моманты ад часу свайго істнаваньня. Ніколі дысцыпліна ў партыі ня была гэтак расхістана, як цяпер. Ніколі аўторытэт галоўнага органу партыі ня быў гэтак паняверан, як у цяперашні час сярод тыя кругі, ад якіх найменей гэтага можна было спадзявацца. Запомніцеся словы Леніна: „Адна адзіная небясьпека пагражае савецкаму камунізму — ўнутраны развал. Гэта было-б сьмерцю партыі і сьмерцю рэвалюцыі". Цыркуляр падпісаны сябрамі палітычнага бюра: Каменевым, Зіноўевым і Сталіным".

Хвароба Троцкага.

Троцкі ізноў моцна захварэў і мае выехаць лячыцца ў Францыю. Як відаць хвароба гэта мае палітычны характар і зьяўляецца пасьледствам опозыцыйнае тактыкі Троцкага ў камуністычнай партыі, якая далікатна высылае галоўнага начальніка чырвонае арміі за граніцу. Невядома толькі, як ён тамака будзе прыняты.

Баўгарыя.

Палітычнае забойства.

У баўгарскай сталіцы Софіі забіты пасол парляманту Пэтко Пэткоў, бышы сэкрэтар Стамболійскага. Забіты вінаваціўся ў замаху на сябров цяперашняга ўраду з мэтаю ўвядзеньня рэжыму ў духу Стамболійскага.

Напад на дыплемата.

Як паведамляюць з Софіі, тамака нарушана начальніцкасьць кватэры югаславянскага ваеннага ашэ падпалкоўніка Мількові́ча. Два невядомых давекі, карыстаючыся з няпрысутнасьці нікога ў доме Мількові́ча ўламаліся ў кватэру і блізу што старанліва перашукалі. У пэўны момант былі налоханы і ўпялі, дзеля таго што дадому вярнуся пані Мількові́ч з двама вурадніками югаслаўскага пасольства. Забраны толькі рэвальвэр, які належаў дзяншчыку. Баўгарскі міністар заграцічных справаў з прычыны гэтага здарэньня выказаў жаль поўнамоцнаму міністру Югаславіі ў Софіі, а шэф дыплёматычнага пратаколу зрабіў тое самае адносна падпалк. Мількові́ча.

Югаславія.

Напружанае унутранае палажэньне.

Венская прэса паведамляе з Белграду, што ўнутрана-палітычнае палажэньне зьяўляецца вельмі напружаным і можна лічыць на неспадзяванкі. З розных частак краю паведамляюць аб нападах на опозыцыйных пасло́ў. Два пасолы сялянскае партыі моцна пакалечаны.

У порт Антывары прыбылі два француская міналосцы.

Нямеччына.

Лідэр нямецкіх народнікаў міністар заграніч ных справаў Штрэзэман у прамове сваёй у Карлсруэ, паміж іншым, сказаў аб заграцічнай палітыцы цяперашняга нямецкага ўраду гэтак:

— У эканамічным і фінансавым сэнсе Нямеччына і Францыя займаюць аднолькавае палажэньне ў сьвеце і дзеля гэтага нам трэба знайсьці шляхі і спосабы, якія далі-б магчымасьць абодвым краём жыць згодна паміж сабою. Мы праграліі вайну і панясьлі матар'яльныя за гэта пасьледзтвы, дзеля гэтага заплацім рэпарацыі паводлуг пляну Даўэса; не магу аднак-жа прызнаць цьвярджэньні вэрсальскага трактату, які зваліў на Нямеччыну поўную адпавядальнасьць за вайну.

Альбанія.

З Белграду паведамляюць, што каталіцкае духавенства ў Паўднёвай Альбаніі разьвівае жывую агітацыю за кандыдатуру італьянскага князя ў каралі поўночнае Альбаніі. У Скутары пануе перакананьне, што новы альбанскі ўрад выкажацца за монархію.

Паустанчы урад.

З Брындызі паведамляюць, што альбанскія нацыяналісты пасьля захапленьня Тіраны звольнілі палітычных арыштантаў Бэкія і Бальпэра, якія ў лістападзе зрабілі замах на Зогуля. Нацыяналісты утварылі провізорычны ваенны ўрад у Тіране і падалі прадстаўнікам Францыі, Італіі і Югаславіі мэморыял, у якім заяўляюць, што ўвесь рух меў унутрана-палітычны характар і што зроблены распараджэньні з мэтаю утрыманьня парадку.

Літва.

Прэзыдэнт рэспублікі даручыў дасюлешняму міністру справядлівасьці Тумэнасу утварыць новы кабінэт міністраў, але дасюль гэта місія Тумэнасу не ўдалася. Магчыма, што ў выпадку адмовы Тумэнаса ад магчымасьці стварыць урад, прэзыдэнт рэспублікі даручыць сфармаваньне кабінэту Круповічусу.

Літоўская нота у Лізе Народаў.

У пачатку гэтага тыдня камітэт рады Лігі Народаў (Швайцарыя, Жэнэва) разглядаў ноту літоўскага ўраду аб палажэньні школьнае справы ў Віленшчыне і, пасьля азнаямленьня з адказам польскага ўраду, пастанавіў зьліквідаваць гэтае пытаньне.

Данія.

Прызнаньне Савета́ў.

У Копэнгагене ўрадова абвешчана аб прызнаньні de jure ўраду Саветаў Даніяю.

Выступленьні беларускіх паслоў у Сойме.

Пры галасаваньні бюджэту прэзыдыуму рады міністраў беларускі пасол *В. Тарашкевіч* і украінскі — Дзьмітрук зрабілі прапазыцыю, каб скрэсьліць дыспозыцыйны фонд у суме 200 тысячаў злотых. Прапазыцыя галасаваньнем адкінена.

Пры абгавараваньні бюджэту Міністэрства Унутраных справаў беларускі пасол *Ф. Яроміч*, паміж іншым, заявіў:

„У Міністэрстве Унутраных Справаў сядзяць людзі старое, пераджытае псыхолёгіі. Беларускія часопісі зачыняюцца. Вучыцялям адмаўляецца ў праве грамадзянства, ад чаго церпіць палажэньне школьнае справы". Прыбыўшы выпадкі катаваньня насяленьня паліцыяй, аратар заявіў, што бандытызм на акраінах будзе істнаваць датуль, пакуль там будзе ўрадаваць цяперашняя паліцыя. Трэба ўзяць паліцыянтаў з мясцовага насяленьня.

Падчас апошніх словаў пасла Яроміча пачуўся голас пасла Гюбнэра: „Ня хочуць ісьці".

Агляд прэсы.

У сувязі з тымі, якія адбыліся, зьменамі у францускім урадзе і выступленьнем у сойме ваеннага міністра гэнэрала Сікорскага польская прэса занята крытыкаю сучаснага палітычнага палажэньня у Эўропе.

Орган правых „Gazeta Warszawska" у артыкуле „Палітычныя цячэньні у Эўропе" піша:

„У дыскусіі, якая йдзе ў нас апошнім часам у Сойме і прэсе, закранута пытаньне — ці сьвет ідзе „направа" ці „налева". Азначэньне гэтае не зусім яснае. Гутарка йдзе аб тым, у якім кірунку разьвіваецца палітычная думка эўропэйскіх народаў і якія партыі бяруць гару ў палітычным жыцьці. Калі бліжэй пазнаёміцца з палітычнымі цячэньнямі ў Эўропе, дык можна сказаць, што яны прадстаўлены дзьвюма партыямі, адну з якіх можна назваць нацыянальнаю, а другую прогрэсыўнаю. Староньнікі нацыянальнае групы лічаць, што прырода чалавечая заўсёды застаецца нязьменнаю і што адносіны паміж народамі заўсёды адныя й тыя самыя; што ў палітыцы рашучым павінен быць інтэрас, а апошняю інстанцыяю — сіла; што разьвіцьцё жыцьця народаў пакараецца вызначаным, нязьменным законам, якіх ніхто ня можа нарушыць бяскарна. А староньнікі прогрэсыўнае групы вераць у дасканаласьць чалавечае прыроды і ў агульны мір і братэрства. Эра гэтая прыбліжаецца па меры таго, як эўропэйскае грамадзянства дэмократызуецца. Эўропэйская дэмократыя павінна палажыць канец нацыяналізму, вайне, тайнай дыплёматыі і інш."

Далей газэта падходзіць да таго, як уклалася палітычнае жыцьцё у найбольш цікавых для Польшчы дзяржавах — Нямеччыне і Савецкай Расеі, як бліжэйшых суседах, з якімі прыходзіцца так ці йначай лічыцца:

„У Нямеччыне, як аб гэтым сьведчаць апошнія выбары, грамадзкая опінія схілілася направа. Праўда — пры ўладзе засталіся Маркс і Штрэзэман, але толькі таму, што немцы, з прычыны зьмены ўраду ў Францыі, хочуць дабіцца новых палягчэньняў і уступак у варунках, якія направадзе не выпаўняюць. З Расеі прыбываюць усе часьцей ведамасьці, якія сьведчаць аб тым, што там насьпявають вельмі сур'ёзныя падзеі, якія далёка ня сьведчаць аб далейшым руху „налева".

Дзеля азначэньня палажэньня неабходна зазначыць, што ў дзяржавах, якія павінны імкнуць да захаваньня адносін, створаных вэрсальскім трактатам, заўважаецца рух „налева", ў той час, як у дзяржавах, якія адкрыта імкнуцца да зьнішчэньня гэтага трактату, ўсё ідуць шпаркім крокам „направа". Рух „налева" выказваецца ў разьбраеньні, а рух „направа" выказваецца ў павялічэньні збройных сіл.

Нямеччына рыхтуецца да новае вайны (рэваншу), Савецкая Расея зьнішчыла камітэты ў арміі і арганізуе яе на старых асновах.

Якая-ж павінна быць пазыцыя ў гэтых варунках Польшчы, — задае пытаньне газэта. Якая павінна быць яе заграцічная і унутраная палітыка?

Павінны глядзець праўдзе ў вочы і не запамінаць аб тым, што новы падзел Польшчы зьяўляецца рэальнаю мэтаю як для нямецкае, так і для савецкае палітыкі. Падзел гэты павінен адбыцца ў той момант, калі прапорцыя сіл эўропэйскіх дзяржаваў зьменіцца на карысьць Нямеччыны, гэта значыць, калі пераможцы ў вялікай вайне 1914—1918 г. г. цераз рух „налева" будуць морально і матар'яльна разьброены, а пераможаныя гэтага часу сама цераз рух „направа" будуць падрыхтаванымі да вайны.

У гэтай вялікай ігры пытаньне йдзе аб істнаваньні польскае дзяржавы. І разумеецца гэтага апошняга факту павінна служыць меркаю пры ацэнцы руху „направа" і „налева" ў лоне розных эўропэйскіх дзяржаваў. З нашага пункту гледжаньня пажаданай была-б зьмена кірункаў, і якраз на больш далёкім Захадзе „направа" і на бліжэйшим Захадзе, ў нашага найбліжэйшага суседа, магчыма далей і хутчэй „налева".

* * *

На тэму аб небясьпецы, якая пагражае з боку Нямеччыны і Савецкае Расеі гаворыць болей шырока прогрэсыўны орган „Kurjer Poranny". У перадавым артыкуле пад загалоўкам „Небясьпека для міру з боку праз меру азброеных" газэта піша:

„Гэнэрал Сікорскі ў прыгожай прамове, сказанай у Сойме выручыў таго, які ня істнуе, міністра заграцічных справаў, ясна азначыўшы заграцічную палітыку. У параўнаньні Літвы з даваеннаю Чарнагорыяй, якая выклікала ваенны пажар на Балканах, крыецца сур'ёзная перасьцярога. „У Расеі, — сказаў наш ваенны міністар, — ня робіцца тайны з таго, што там ідуць скрытыя прыгатаўленьні да камуністычнага пераваротy пад кіраўніцтвам чырвонага Напалеёна — Троцкага".

У гэтых варунках, — „з прычыны новых цячэньняў у сэнсе разьбраеньня павінны надаць заходнім дэмократам падробны абраз ня толькі нашых мірных імкненьняў, але й

Газэту прачытай і перадай суседу! Той, хто умее чытаць, ніколі не палянуйся прачытаць няпісьменнаму!

нашых нябясьпекаў... Трэба прыказаць разброіцца тым, хто праз меру азброены.

Няма гэткае сілы, якая магла-б змусіць разброіцца суседнюю з намі Чырвоную Імперыю. Дзеля гэтага тым болей Польшча, якой павінны быць даны спосабы, патрэбныя для таго, каб яна не зрабілася мостам, па якім бальшавізм мог-бы перастуціць у Эўропу, павінна строга клапаціцца аб тым, каб дэмократыя на Захадзе бачыла ў ёй толькі крэпасьць міру, а не „жандара Эўропы".

Уся рэшта артыкулу гаворыць аб тых палітычных зьменах, якія надыйшлі у Эўропе у сувязі з пераменаю улады у Францыі, і якіх вывад павінна зрабіць з гэтага польская дыпломатыя.

ТУТЭЙШАЯ ХРОНІКА.

— **Беларускае Грамадзянскае Сабраньне** закончыла рэмонт залі, якая пасьля агляду яе гэтымі днямі урадоваю камісіяй будзе ужыта пад Беларускі тэатр. Заля разьлічана на 600 сядзячых месцаў. Тэатр арганізуецца грамадзянінам Сычэнсовічам. Апрача драматычнае трупы ужо з'арганізаваўся Беларускі хор і судзячы на рэпэтыцыях — хор гэты будзе нябывалым дасюль у Вільні.

— Акончаны рэмонт і памяшканьня клюбу Бел. Грам. Сабраньня. Клюб мае асобную залю, чытальню, бібліятэку, більярдную, сталовую і кабінэты.

— **Віленская Беларуская Гімназія**, як мы даведаліся, мае адтрымаць з будучага школьнага году правы выдаваць матуры (атэстаты сьпеласьці) скончыўшым яе вучням.

— **Збор на карысьць ваенных інвалідаў.** Урад саюзу ваенных інвалідаў 20 г. м. прыслаў у Беларускае Грамадзянскае Сабраньне запрашэньне выслаць да сэкрэтарыяту саюзу свайго прадстаўніка дзеля арганізацыі Камітэту па вулічнаму зборы на карысьць ваенных інвалідаў, які мае адбыцца 6 ліпня г. году.

— **Абавязковае страхаваньне рабочых.** Распараджэньнем Міністэрства Працы і Грамадзкае апекі 7 гэтага чэрвеня пашыраны на Віленшчыну закон аб абавязковым страхаваньні рабочых ад няшчасных здарэньняў.

— **Не хапае 700 злотых.** Камітэт па арганізацыі экскурсіі польскіх журналістаў, якія пядаўна гасьцілі ў Вільні, зьвярнуўся ў магістрат з просьбаю пакрыць дэфіцыт, які адтрымаўся ад устройства прыёму экскурсіі, ў суме 700 злотых. Усяго камітэт зрасходаваў 1200 злотых.

— **Калі пайдзе у Вільні трамвай?** Есьць весткі ў магістраце, што трамвайны рух па Вільні пачнецца толькі з другое паловы ліпня месяца.

— **У Беларускае Грамадзянскае Сабраньне** чытачы нашыя могуць зьвяртацца за юрыдычнымі парадамі, як асабіста, так і па пошце. Бедным парады будуць рабіцца дарма. На пісьменныя пытаньні адказы будуць давацца праз „Грамадзкі Голас".

Парады будуць рабіцца лепшымі адвакацкімі сіламі гор. Вільні.

— **Польскі Банк** адмяніў пастанову аб паніжэньні вартасьці падраных банкнотаў новых польскіх папяровых грошай — злотых. Калі папяровы банкнот будзе крыху разадраны, але мае на сабе ўсе знакі нумару і сэрыі, дык ён абавязковы да прыманьня ўсімі грамадзянамі бяз ніякае спрэчкі.

Калі марка пакіне лічыцца грашыма?

Даводзім да ведама нашых чытачоў, што згодна з распараджэньнем Міністэрства скарбу польская марка з 1 ліпня гэтага году перастае быць праўным плацежным значком, гэта значыць, што прадаўцы і тыя, хто купляе, не абавязаны прымаць яе за тавары, альбо як рэшту. Ад 1 ліпня гэт. году да 25 траўня (мая) 1925 году маркі абавязаны прымаць толькі Польскі Банк і Скарбовая Ізба.

Жыцьце провінцыі.

Беларускія спэктаклі.

Нам пішуць з *Радашкавічаў*, Вялейскага павету:

„У нядзелю 14 і панядзелак 15 гэтага чэрвеня ў нашым мястэчку адбыліся два спэктаклі. Ставілі „Паўлінку" Янкі Купалы і „Страхі жыцьця" Ф. Аляхновіча з удзелам самога аўтора ў ролі Сымона. Абодва спэктаклі вельмі ўдаліся пры саўсім поўных зборах.

Асабліва моцнае ўражаньне выклікала ігра Аляхновіча ў яго „Страхах жыцьця". П'еса малюе жудасны абраз меставога жыцьця ў нядаўні час вайны. Трагічныя момэнты п'есы ў неапісальным выкананьні самога аўтора выклікалі сьлёзы ў шмат каго з глядзеўшае п'есу публікі.

N. N.

Апошнія навіны.

Пасьля забойства Маттэотті у Італіі.

„Giornale d Italia" паведамляе, што Папа прыняў на прыватнай аудыенцыі жонку забітага пасла Маттэотті.

Судовыя італьянскія ўлады наклалі сэквэстар на маемасьць адваката Філіпі ў Мілане. Ходзяць чуткі, што у шмат якіх італьянскіх местах адбыліся многалюдныя маніфэстацыі ў чэсьць Мусоліні. Лібэральная партыя тэлеграфна засьведчыла сваю поўную з ім солідарнасьць.

Орган фашыстаў „Corriere d'Italia" зачынены.

Перарваньне дыплематычных зносін.

Англія перарвала дыплёматычныя зносіны з Мэксыкай. Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты і рэспубліка Чылі, ў асобе сваіх прадстаўнікоў, узялі на сябе абарону ангельскіх грамадзян у Мэксыцы.

Новы старшыня французскага сэнату.

Старшынёю французскага Сэнату выбраны кандыдат Рэспубліканскага Саюзу дэ-Сэльв большасьцю 154 галасоў проці 151, паданых за кандыдата левых партыяў Мартэна. Новы старшыня сэнату зьяўляецца асабістым прыяцелем бышага прэзыдэнта рэспублікі Мільерана. Дэ-Сэльв радзіўся ў Тулузе ў 1848 годзе. Некалькі разоў быў міністрам.

Аб паніжэньні заробку друкарскім рабочым у Варшаве.

З прычыны крызысу ў выдавецкім промысьле, выкліканага праз меру высокімі заробкамі друкароў, саюз выдаўцоў распачаў акцыю ў кірунку рэвізіі друкарскага дняўніка, прапануючы складальнікам паварот да перадваенных заробкаў з дадаткам 30% на дарагоўлю. Устаноўлены гэткім чынам мінімум заробку быў-бы ў Варшаве 43,88 злот. на тыдзень, тады як цяпер ён раўняецца 85 злот.

Французска-расейскія зносіны.

Францускі прэм'ер-міністар Эрыо выклікаў у Парыж поўнамоцнага міністра ў Рызе Мартэля, якому мае быць паверана спэцыяльная місія ў Расеі.

Палітычная амнэстыя у Францыі.

Унесены урадам Эрыо ў палату дэпутатаў праэкт закону аб амнэстыі, прадбачыць поўную амнэстыю для ўсіх палітычных арыштованых лічачы з 1914 году.

Спатканьне прэм'ерау Францыі і Англіі.

Паводлуг адтрыманых дёпэшаў прэсаю вестак з Парыжа, французскі прэм'ер-міністар Эрыо выедзе ў Лёндан якнайхутчэй дзеля спатканьня з прэм'ерам Англіі Мак-Дональдам.

УСЯЧЫНА.

Дзе труп Мікалая II?

На шпальтах парыскае газэты „Matin" гэнэрал Жанэн, былы шэф французскае ваеннае місіі ў Сыбіры, расказвае аб тым, як у сваім часе яму было даручана перавязеньне ў Францыю трупа бышага цара Мікалая, царыцы і царанят дзеля адданьня вялікаму князю Мікалаю Мікалаевічу. Выпаўняючы гэтую задачу гэн. Жанэн прывёз труп у Францыю і пад Grenoble аддаў яго 16 кастрычніка 1920 г. бышаму расейскаму амбасадару ў Рыме Гірсу. Трупы іншых вялікіх княжат, сяброў царскае сям'і, гэн. Жанэн загадаў пахаваць у Пэкіне (Кітайшчына).

Пафарбованы брук.

У Англіі стараюцца ўрэгуляваць шпаркасьць руху самаходаў, каб меней няшчасьцяў на гарадзкіх вуліцах здаралася з публікаю. Дзеля гэтага проектуецца пафарбаваць вулічны брук у розныя колеры, лічачы пэўны колер за аснову шпаркасьці руху. На тых, напрыклад, вуліцах, дзе небясьпекі ад руху самаходаў няма і на якіх, дзеля гэтага, магчымы найшпарчэйшы рух, брук будзе пафарбованы зялёнаю фарбаю. Болей небясьпечныя вуліцы, дзе занадта шпаркая язда самаходаў можа пагражаць публіцы, будуць мець пафарбованы аранжаваю фарбаю брук; гэта мае значыць, што шофэрам нельга разьвіваць шпаркасьць, якая пераходзіла-б за устаноўленую паліцыяй норму. Афарбоўка гэта выгадна яшчэ й тым, што адначасна на гарадзкім пляне, які ёсьць у кожнага паліцэйскага, вуліцы адзначаны тымі самымі фарбамі, якія і на бруку. У выпадку нарушэньня правілаў аб пэўнай шпаркасьці язды, паліцэйскі адразу мае магчымасьць справіцца, да якой катэгорыі адносіцца тая ці іншая вуліца.

Цяпер у Англіі робяць практыку прымешваньня да брукавога бэтону розных фарбаў. Думаюць, што фарбованы брук будзе прыемнейшым для вока, як цяперашні чысты асфальтавы, які ад надта яснага сонцавага асьвятленьня рэжа вока сваім белым колерам.

Суд над штукаром—камуністам.

У міравым судзе ў Празе (Чэхаславакія) разьбіралася справа пасла камуніста Гакона, абвінавачванага ў тым, што 6 сакавіка ў паседжаньні парляманту ён паставіў на трыбуне перад старшынёю рады міністраў Швэглё бутэльку сьпірту, ў корак якое быў устаўлены маленечкі сьцяг з невядомымі колерамі. Міністар Швэглё адкінуў бутэльку, а прэзыдыум заявіў, што ня бачыць перашкодаў да пацягненьня пасла ў суд за зьнявагу дзяржаўнага сьцягу. У судзе пасол Гакон заявіў, што выстаўленьне бутэлькі лічыць палітычнаю дэмонстрацыяй і што саўсім не хацеў зрабіць зьнявагі дзяржаве. Судзьдзя прызнаў, што Гакон перайшоў межы пазволенае ироніі і палітычнае дэмонстацыі і засудзіў яго на 5 дзён арышту альбо штрафу 500 чэскіх каронаў. Адвакат Гакона абжалаваў прыгавар судзьдзі.

(„В. У.").

БЕЛАРУСКІЯ КНІЖКІ.

Выданьня У. Знамяроускага можна набываць таньней, як усюды, у Клюбе Белар. Грамадзянскага Сабраньня, на Людвісарскай вул., 4.

Маюцца гэткія кніжкі:

У. Ігнатоускі — Гісторыя Беларусі.
М. Гарэцкі — Гісторыя беларускае літэратуры.
А. Гарун — Сцэнічныя творы для дзяцей.
М. Бурачок — Смык Беларускі.
" — Дудка Беларуская.
А. Пауловіч — Снапок.

Выдавец: Беларускае Грамадзянскае Сабраньне. Рэдактар: Язэп Салавей. Друкарня „Lux", вул. Жэлігоўскага, 1. Тэлеф. № 203.